# РАБОЧАЯ РЭП САЛІДАРНАСЦЬ

ІНФАРМАЦЫЙНЫ ВЫПУСК БЕЛАРУСКАГА ПРАФСАЮЗА РАБОТНІКАЎ РАДЫЁЭЛЕКТРОННАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ (РЭП) І ІНШЫХ ГАЛІН НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ

№ 9-10 (310-311) www.praca-by.info • profrep@gmail.com • r.salidarnasc@gmail.com 3 чэрвеня 2020


## ГЕНАДЗЬ ФЯДЫНІЧ: ПРАФСАЮЗ РЭП АДКРЫТЫ ДЛЯ МЕДЫКАЎ



*Медыцынскія работнікі, якія сёння змагаюцца з эпідэміяй каронавіруса ў Беларусі, аказваюцца пад агнём з усіх бакоў: цяжкія ўмовы працы, недахоп сродкаў абароны, нізкія зарплаты; у той жа час Лукашэнка нападае на іх за тое, што медыкі нібыта самі вінаватыя ў распаўсюджванні хваробы, грамадства папракае медыкаў у тым, што яны маўчаць, не распавядаюць праўду пра сітуацыю, а ўлада ціснe на тых, хто кажа праўду і скардзіцца на праблемы. Што рабіць?*

**Лідэр Беларускага прафсаюза РЭП Генадзь Фядыніч звярнуўся да медыцынскіх работнікаў краіны:**

– Сёння на фронце барацьбы з каронавірусам у самых першых шэрагах знаходзяцца нашы медыкі. За гэта ім наша вялікая павага і падзяка. Натуральна, што многія сутыкаюцца з праблемамі. Многія адчуваюць непакой і страх не толькі захварэць, але і страціць працу, падвергнуцца ціску і нават, як мы ўжо бачылі, арышту. Гэту сітуацыю нельга лічыць нармальнай. Але напружанасць і няўпэўненасць стварае ў нас сама дзяржава. Я перакананы, што, калі б увялі няхай не жорсткі каранцін, як у іншых краінах, але хаця б масакавы рэжым – у паліклініцы, у краме, у банку, у грамадскім транспарце, – у медыкаў было б менш працы. На жаль, такія элементарныя меры, якія не патрабуюць нават спецыяльных выдаткаў, свядома ігнаруюцца уладай. Калі б Міністэрства аховы здароўя давала рэальныя лічбы захворванняў і смяротнасці, нічога страшна не здарылася б, ніякай панікі не было б. Наадварот, людзі сталі бы больш асцярожныя, ня падвяргалі б лішні раз небяспецы сябе і іншых. Але ўлада гэтага не робіць.

Медыцынскія работнікі працуюць сёння ў экстрэмальных ўмовах, якія не падпадаюць ні пад якое працоўнае заканадаўства. Тут ёсць маса парушэнняў. Гэта і праца звыш нормы, стомленасць, псіхалагічная нагрузка і стрэс. Але на ўсё гэта фактычна ніхто не звяртае належнай увагі. Кажуць пра нейкія даплаты. А ці будуць гэтыя даплаты для ўсіх і ў тых аб'ёмах, якія былі абяцаныя? Ці ні атрымаецца як з заробкамі тым жа медыкам, калі змянілі тарыфы?

Таму сёння я звяртаюся да ўсіх медыцынскіх работнікаў Беларусі. Калі ў вас узнікаюць якія-небудзь пытанні ці праблемы, звязаныя з вашай працаю, калі ідзе гаворка аб ахове працы, выплатах, ціску адміністрацыі і да г.п., вы заўсёды можаце бясплатна атрымаць кансультацыю ў нашым прафсаюзе РЭП. Зазірніце на наш сайт praca-by.info, паглядзіце бюлетэнь прафсаюза "Рабочая Салідарнасць", пашукайце нас у сацыяльных сетках. Там вы знойдзіце тэлефоны не толькі Мінскага офіса, але і іншых гарадоў, усіх абласных цэнтраў. Звяртайцеся, і вы атрымаеце кваліфікаваную кансультацыю і дапамогу юрыстаў.

*працяг на стар. 2*

## ЯК ЖЫВУЦЬ РЭГІЁНЫ?

**Распавядаюць рэгіянальныя лідэры прафсаюза РЭП Васіль Берасneў, Галіна Смірнова, Уладзімір Малей**

*чытайце на стар. 4-5*

## БЕЛАРУСЬ: У РАБОТНИКОВ СТАЛО МЕНЬШЕ ПРАВ

**Государственный департамент США ОТЧЕТ О ПРАВАХ ЧЕЛОВЕКА ПО СТРАНАМ ЗА 2019 ГОД: БЕЛАРУСЬ Раздел 7. Права работника**

*читайте на стр. 6-7*




## СУСВЕТНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ (СААЗ) ЗАНЕПАКОЕНА СІТУАЦЫЯЙ У БЕЛАРУСІ І ЎСЁЙ УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ

Беларусь увайшла ў пяцёрку краін Еўропы, дзе было зарэгістравана найбольшая агульная колькасць пацверджаных выпадкаў COVID-19 за апошнія 14 дзён. Пра гэта паведаміў кіраўнік Еўрапейскага бюро СААЗ Ганс Клюге.

Па словах Клюге, Беларусь, Расея, Вялікая Брытанія, Турцыя ды Італія сталі краінамі, у якіх за апошнія два тыдні зарэгістраваная самая вялікая колькасць выпадкаў заражэння COVID-19 у Еўропе.

Ён таксама паведаміў, што ў 53 еўрапейскіх краінах, дзе жывуць 900 млн чалавек, у цэлым пацверджана больш за 2 мільёны выпадкаў COVID-19, больш за 175 тысяч чалавек памерлі.

*працяг на стар. 3*

# ГЕНАДЗЬ ФЯДЫНІЧ: ПРАФСАЮЗ РЭП АДКРЫТЫ ДЛЯ МЕДЫКАЎ

*пачатак на стар. 1*

Хоць звычайна мы аказваем дапамогу сябрам прафсаюза, але цяпер, у сітуацыі пандэміі, прафсаюз пойдзе насустрач і акажа бясплатна неабходную юрыдычную дапамогу ўсім медыцынскім работнікам, якія звернуцца да нас.

Акрамя таго, і працоўныя, і дзяржава, і ўсе наймальнікі павінны ведаць, што Міжнародная арганізацыя працы нядаўна выступіла з канкрэтнымі і жорсткімі рэкамендацыямі для ўсіх краін, уключаючы Беларусь. У іх, у тым ліку, гаворыцца аб праве працаўнікоў спыніць працу, калі яе ўмовы ствараюць непасрэдную і сур'ёзную небяспеку жыццю і здароўю. Наймальнікі павінны памятаць: яны сёння абавязаны інфармаваць людзей аб небяспецы, забяспечваць неабходнымі на працоўных месцах сродкамі для абароны жыцця і здароўя людзей – касцюмамі, маскамі, пальчаткамі, і калі іх не хапае, – своечасова вырашаць гэтыя праблемы.

Пра гэта маўчаць нельга. Памерці заўсёды паспеем, а вось ці паспеем нармальна пажыць пры гэтай уладзе – гэта яшчэ пытанне.

# МЕДЫКІ «ЗГАРАЮЦЬ» НА ПРАЦОЎНЫХ МЕСЦАХ, А ЎЛАДЫ ЗАЦІСНУЛІ ГЭТЫЯ КАПЕЙКІ

*Беларусь абляцелі кадры бунту бабруйскіх лекараў хуткай дапамогі, якія не дазволілі БТ зняць прапагандысцкі сюжэт. Медыкі не атрымалі абяцаныя грошы за перапрацоўку падчас эпідэміі, а афіцыйная тэлевізія прыехала "замяць" гэтую праблему. Тое, што адбылося ў Бабруйску, – не адзіны выпадак. СМІ распавядалі дзясяткі гісторый медыкаў, якія былі ашуканы ўладамі і засталіся без абяцаных даплат за працу з хворымі на каронавірус.*

**У інтэрв'ю сайту Charter97 Генадзь Фядыніч распавёў пра тое, як лепш абараняць свае правы работнікам медыцыны.**

– Я бачу непасрэдную віну Міністэрства аховы здароўя Беларусі ў гэтай сітуацыі. Прынцыпы пастановы аб даплаце для медыкаў – абсалютна нармальныя, але пры іх выкананні пачынаецца тэатр абсурду. Навошта лекар павінен яшчэ вылічваць нейкія хвіліны ці гадзіны працы? Ім што, з нататнікам і секундамерам бегаць?

Чыноўнікі не павінны лезці ў гэтыя справы. Для вырашэння такіх пытанняў ёсць галоўны лекар, ёсць адміністрацыя. Людзі працуюць, і яны не павінны нават думаць пра гэта, а проста ведаць, што сваё атрымаюць. Гэта іх сумленна зробленыя сродкі.

З аднаго боку, улада дае на паперы магчымасць атрымаць даплаты, а на практыцы – нічога няма. Я бачу тут прамую непавагу і пагарду да медыцынскага персаналу. Такая бездакзнасць уладаў у дачыненні да сваіх людзей рана ці позна вернецца да іх бумерангам. Да ўсіх, хто свядома ці неўсвядомлена парушае правы медыкаў: кожны павінен будзе адказаць за свае ўчынкі. Медыкі "згараюць" на працоўных месцах, а ўлады заціснулі гэтыя капейкі.

**Лекары распавядаюць шакуючыя гісторыі пра тое, у якіх умовах ім даводзіцца працаваць. Асабліва – у рэгіёнах. Ці ёсць нейкае пазначэнне такіх умоў працы ў законе?**

– У Працоўным кодэксе ёсць артыкулы, якія наўпрост кажуць пра тое, што калі працоўная дзейнасць кожнага чалавека (неабавязкова медыка) пагражае ягонаму здароўю, ён можа яе пакінуць. Калі б лекары калектыўна так паступілі, то заўтра ўжо сродкі аховы б з'явіліся. Колькі ўжо прайшло месяцаў эпідэміі, а лекараў і медсясцёр нельга сёння забяспечыць элементарным? Што гэта такое?

Акрамя гэтага ёсць шэраг іншых парушэнняў Працоўнага кодэкса. Па-першае, ідзе масавая перапрацоўка. Ніхто гэта не фіксуе. Таксама парушаюцца ўмовы рэжыму працы і адпачынку. Ёсць шмат пытанняў, якія тычацца бяспекі і здароўя. Колькі ўжо прайшло месяцаў эпідэміі, а лекараў і медсясцёр нельга сёння забяспечыць элементарным? Галоўны абавязак наймальніка – ужо сёння забяспечыць медыкаў спецадзеннем, сродкамі індывідуальнай аховы і папярэдзіць людзей, калі ёсць нейкая найменшая небяспека для іх здароўя. Паўтаруся, гэты быць сёння выпушчаны: ні факт незабеспячэння спецадзеннем, ні факт пагрозы здароўю медыкаў. Лекары павінны разумець, што яны таксама людзі. Мы турбуемся цяпер за іх здароўе. Калі сітуацыя будзе працягвацца ў тым жа духу, то хто будзе нас лячыць?

Я не здзіўлюся, калі пасля таго, як пройдзе гэтая хваля і адкрыюцца межы, частка медыкаў пакіне краіну ў "падзяку" уладам за стаўленне да іх.

**– Ці гатовы незалежны прафсаюз РЭП дапамагчы беларускім лекарам абараніць свае правы?**

- Ёсць пастанова, пра яе трэба публічна згадваць і не баяцца ісці ў суд. Бабруйскія медыкі паказалі выдатны прыклад самаарганізацыі, які ўсім трэба браць на ўзбраенне. За свае правы трэба змагацца. Іх так проста ніхто ніколі не даваў.



абавязак працадаўцы ніхто не касаваў. Таму тыя пытанні, якія звязаны з аховай працы, тэхнікай бяспекі, выплатамі, перапрацоўкамі, – гэта масавыя парушэнні, якія сёння адчуваюць на сабе медыкі Беларусі.

Тыя, хто непасрэдна працуе з хворымі на каронавірус, абароненыя спецкасцюмамі. Але ёсць жа яшчэ і іншыя лекары, якія сёння працуюць не наўпрост. І яны сёння паміраюць.

Скажу, што простым росчыркам пяра досыць увесці хоць бы пальчаткава-масканы рэжым у Беларусі. У цяперашняй эпідэміялагічнай сітуацыі ні на рынкі, ні ў банкі, ні ў крамы, ні ў паліклінікі чалавек не павінен хадзіць без маскі і пальчатак.

**– Ці могуць медыкі пачаць масавыя працэсы супраць улады, якая не выканала свае прамыя абавязкі для іх абароны?**

– Думаю, што гэта трэба пачынаць ужо сёння. Я мяркую, што ніводзін факт не павінен

Калі будзе два-тры прэцэдэнты – стане толькі прасцей. Далей можна будзе развязваць кожную праблему, у якім рэгіёне яна б не здарылася. Трэба не баяцца ісці да канца, таму што гэта чалавечае здароўе, у рэшце рэшт, бяспека, а жыццё даецца адзін раз.

Прафсаюз РЭП гатовы дапамагчы беларускім медыкам. Калі хтосьці не хоча называць імя, можа не называць. Ёсць электронная пошта, тэлефоны ў кожнай вобласці, ёсць юрысты. Хтосьці працуе дыстанцыйна, хтосьці яшчэ ходзіць у суды.

Хай медыкі да нас звяртаюцца. Яны атрымаюць кваліфікаваны адказ і бясплатную юрыдычную кансультацыю, нягледзячы на тое, што мы надаем найперш дапамогу сябрам прафсаюзу. Калі будзе неабходнасць падрыхтаваць адпаведныя позвы ў суд, – мы іх зробім.

# СУСВЕТНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ (СААЗ) ЗАНЕПАКОЕНА СІТУАЦЫЯЙ У БЕЛАРУСІ І ЎСЁЙ УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ

*пачатак на стар. 1*

94% усіх памерлых пацыентаў – гэта людзі старэйшыя за 60 гадоў, у 59% выпадкаў – мужчыны. 97% усіх смерцяў было сярод тых, хто меў хоць бы адно асноўнае захворванне, прычым сэрцава-судзінныя захворванні былі галоўнай спадарожнай паталогіяй.

Клюге таксама паведаміў, што на Еўропу прыпадае 38% усіх выпадкаў інфікавання і блізу 50% смяротных вынікаў у свеце.

На думку незалежных экспертаў, каронавірусам у Беларусі маглі заразіцца ўжо блізу мільёна чалавек, памерці маглі блізка 10 тысяч. Лічбы, апублікаваныя Міністэрствам аховы здароўя, верагодна істотна заніжаныя і не выклікаюць даверу ў беларускіх лекараў.

Тым часам у Заходняй Еўропе назіраецца значнае зніжэнне захворвання.

Колькасць новых выпадкаў заражэння каронавірусам, якія рэгіструюцца за дзень, устойліва скарачаецца ў Заходняй Еўропе, аднак назіраецца рост у Расеі і Усходняй Еўропе, заявіла прадстаўніца Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Маргарэт Харыс, паведамляе інфармацыйная агенцыя Reuters.

«Цяпер у Еўропе, у Заходняй Еўропе, мы назіраем ўстойлівае зніжэнне. Яно не імклівае, але ёсць устойлівае зніжэнне новых выпадкаў, якія рэгіструюцца за дзень, так што гэта азначае, што колькасць новых выпадкаў усё яшчэ значная, але гэтая колькасць зніжаецца, за выключэннем Расеі і Усходняй Еўропы, дзе мы ўсё яшчэ назіраем рост», – адзначыла спадарыня Харыс.

*Па матэрыялах Інтэрнэт*

# УЛАДА БЕЗ МЕДЫКАЎ НЕ ПРАЖЫВЕ

***Прапановы прафсаюза медыкам звяртацца ў РЭП пракаментаваў Васіль Завадскі, медык, праваабаронца, сябра прафсаюза РЭП***

За сваю даволі доўгую практыку ў сферы аховы здароўя я неаднойчы сутыкаўся з сітуацыяй, калі медыкі павінны былі атрымліваць даплаты за працу ў асаблівых умовах. Амаль заўсёды з гэтым былі праблемы. Зараз гісторыя паўтараецца. Наколькі я ведаю, у адных установах даплаты ўжо атрымалі, у іншых яшчэ не. Ізноў жа сумы вельмі розныя. Зразумела, шмат хто застаецца незадаволеным, і ў кожным выпадку трэба разбірцца канкрэтна.

Яшчэ адзін важны аспект, што медыкаў прымушаюць маўчаць – не скардзіцца на ўмовы працы, даваць падпіскі “пра неразгалошванне” рэальнай статыстыкі. На непакорлівых ціснуць, нават караюць “суткамі”, як гэта здарылася з фельшарам Паўлам Палейчыкам з Ліды, які паспрабаваў публічна сказаць нешта пра ўмовы працы. Гэта сумны прэцэдэнт, але не адзінкавы. Мы бачым, як імкнуцца ўлады прыдушыць незадаволенасць медыкаў, якія спрабуюць яе выказваць, як гэта адбывалася ў Бабруйску, Полацку, у іншых месцах.

Так што падстаў у маіх калегаў-медыкаў, каб звяртацца па абарону, хапае, і будзе яшчэ больш. Як паказвае практыка, афіцыйныя прафсаюзы наўрад ці стануць на абарону медычных работнікаў. Трэба звяртацца ў незалежныя прафсаюза і канкрэтна, у прафсаюз РЭП.

Я падтрымліваю заяву нашага лідэра Фядыніча і заклікаю звяртацца да нас. Я гатовы сам падключыцца да працы непасрэдна з медычнымі работнікамі, якія звернуцца ў прафсаюз за дапамогай.

Увогуле хацеў бы заклікаць сваіх калегаў-медыкаў адчуваць сябе больш вольнымі, паважаць сваю годнасць, не маўчаць і не скакаць пад дудку кіраўніцтва. Улада без медыкаў не пражыве, а не наадварот.




*Пратэстуюць бабруйскія медыкі*

# ПРА ПРАВЫ МЕДЫЦЫНСКІХ РАБОТНІКАЎ ВА ЎМОВАХ ПАНДЭМІІ COVID-19

**Пра правы медыцынскіх работнікаў распавядае прававы інспектар прафсаюза РЭП Генадзь Воранаў**

Медыцынскія работнікі маюць гарантыі забеспячэння правоў на ахову працы. Згодна з Працоўным кодэксам Рэспублікі Беларусь работнік мае права на працу як найбольш годны спосаб самасцвярджэння чалавека, а таксама на здаровыя і бяспечныя ўмовы працы. У сітуацыі, якая склалася, згодна з рэкамендацыямі Міністэрства аховы здароўя і мясцовых органаў улады, наймальнік абавязаны ажыццяўляць мерапрыемствы па прафілактыцы і не дапушчэння распаўсюджвання інфекцый, выкліканых COVID-19.

Наймальнік абавязаны забяспечыць кантроль за станам здароўя персаналу, ажыццяўляць тэрмаметрыю ў пачатку працоўнага дня, наяўнасць антысептыкаў для апрацоўкі рук, абавязковае выкарыстанне індывідуальных масак і наяўнасць іх запасу, выкарыстанне і абавязковую наяўнасць у запасе ахоўных халатаў і іншых спецыяльных сродкаў, якія абараняюць медыцынскі персанал ад рызыкі заражэння каронавіруснай інфекцыяй.

Гэта не проста рэкамендацыі. Гэта тыя нешматлікія абавязкі, якія для наймальніка абавязковыя для выканання дзеля абароны сваіх работнікаў ад заражэння. У выпадку невыканання або неналежнага выканання абавязкаў наймальніка па забеспячэнню здаровых і бяспечных умоў працы работнік можа адмовіцца ад выканання сваіх працоўных абавязкаў.

Справа ў тым, што згодна з **арт. 11 Закона Рэспублікі Беларусь** аб ахове працы, работнік мае права на адмову ад выканання даручанай работы ў выпадку ўзнікнення непасрэднай небяспекі для жыцця і здароўя яго і навакольных да ліквідацыі гэтай небяспекі. Па ўказаным артыкуле работнік абавязаны неадкладна пісьмова паведаміць працадаўцу аб матывах такой адмовы, падпарадкоўвацца правілам унутранага працоўнага распарадку, за выключэннем выканання вышэйпаказанай працы.

Згодна з **арт. 223 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь** пры адмове работніка ад выканання даручанай работы ў выпадку ўзнікнення непасрэднай небяспекі для жыцця і здароўя яго і навакольных, непрадастаўлення яму сродкаў індывідуальнай абароны, непасрэдна забяспечваюць бяспеку працы работніку да ліквідацыі парушэнняў павінна быць прадастаўлена іншая праца, якая адпавядае яго кваліфікацыі, альбо, з яго згоды, праца з аплатай не ніжэй за сярэдняга заробку па ранейшай працы на тэрмін да аднаго месяца.

Ведайце свае правы, беражыце сябе і сваіх блізкіх.

*Матэрыял быў апублікаваны на сайце Беларускага Незалежнага прафсаюза*

# ЯК ЖЫВУЦЬ РЭГІЁНЫ?

## Васіль Берасьнеў, Аршаншчына: ТРЭБА НЕ ГУБЛЯЦЬ РЫТМ

Сітуацыя ў нас на Аршаншчыне напружаная, хворых шмат, тры шпіталя працуюць як інфекцыйныя, Бараньскі шпіталь цалкам пераведзены на інфекцыю. Інфармацыю ўлады даюць вельмі няпоўную, пра многае людзі даведваюцца адзін ад аднаго. Шмат хворых не толькі сярод жыхароў, але і сярод медыкаў.



Але сябры нашай арганізацыі пакуль трымаюцца, хворых не маем. Нягледзячы на абставіны, мы сваёй працы не спыняем, хаця захоўваем належныя меры бяспекі. Два разы на тыдзень, як трэба, сустракаемся з людзьмі ў нашай грамадзкай прыёмнай. Сябры прафкаму рэгулярна тэлефануюць сябрам прафсаюзнай арганізацыі – удакладняюць стан здароўя, падтрымліваюць маральна, каб захоўваўся нармальны настрой.

Мы хадзілі у суд падтрымаць нашу моладзь, блогераў, якія кармілі галубоў, але нас так і не дапусцілі. Я напісаў вялікую петыцыю, у адказ паведамілі, што гэта праз эпідэмію.

У судах мы выйгралі ў траўні дзве справы – Таццяны Гарагляд, якую хацелі несправядліва пазбавіць мацярынства, і механізатара сельгаспрадпрыемства Маяк-Высокае Юрыя Гута, з якога прадпрыемства незаконна спрабавала спагнаць грошы. Зараз вядзем яшчэ адну справу па кантракце работніка Аршанскай спецаўтабазы.

Зараз пачалася выбарчая кампанія, і большасць сябраў арганізацыі дапамагаюць дэмакратычным кандыдатам.

Відавочна, што ў краіне пайшоў нейкі ўздым. Людзі больш не вераць уладзе. Цэлыя натоўпы стаяць у нас рэгулярна каля пікетаў дэмакратычных кандыдатаў, ставяць свае подпісы, і галоўная думка ў большасці – толькі б не ён, хутчэй бы ён зышоў.

Вядома, паўплывала тут і эканамічная сітуацыя, а асабліва тое, што адбываецца з гэтым каронавірусам. Людзі пабачылі гэтую бязглуздзіцу ў падыходах да эпідэміі, убачылі, што іх ніхто не абараняе, іх проста кінулі, не было ніякіх сродкаў, і ўрачы самі часта не ведалі, што рабіць. Усё замоўчвалася. Медыкі хуткай дапамогі нават спрабавалі рабіць у нас забастоўку, таму што іх пакінулі без сродкаў абароны, без даплатаў.

Такім чынам улада сама стварыла гэтую крытычную сітуацыю. Замест таго, каб людзей падрыхтаваць, зрабіць усё для абароны, рабілі выгляд, што нічога не адбываецца. Вось людзі і не вытрымалі. Я мяркую, перамены набліжаюцца.

Увогуле, мы спакою не даем, працуем. Трэба не губляць рытм.

## Галина Смирнова, лидер Бобруйской организации РЭП
## ВЛАСТИ СДЕЛАЛИ ХУЖЕ САМИ СЕБЕ!

После того, как меня, Владимира Романовского и Александра Борисенко задержали 9 мая, я написала заявление в прокуратуру на действия сотрудников милиции. Они доставили меня в ГАИ, хотя никаких правил движения мы не нарушали. С меня сорвали значок, забрали все вещи, телефон. Никакого обвинения мне не так и не предъявили. Привели в отделение на второй этаж и спрашивают: «А за что вас задержали?» Я отвечаю: «Это я вас спрашиваю, за что меня задержали и что вам от меня нужно?» Так никаких претензий мне и не предъявили и протокола не составили. Из милиции после моей жалобы ответили, что дело на меня завели, но оно было закрыто.

Бюллетени "Рабочая Солидарность" тем, у кого их конфисковали, так и не вернули. Я свои милиционерам не отдала.

Теперь мы с нашей группой все больше включаемся в действия. Эти протесты, репрессии подтолкнули людей активизироваться. Было много задержанных, и мы их всех поддерживали. Собрали помощь по всему Бобруйску и теперь наладили контакты с участниками акции, подружились с людьми и в результате членов в нашей организации прибавилось. Таким образом, власти сделали хуже сами себе.

Идея поддержать медиков очень хорошая, жаль только, что у нас в Бобруйске нет своего юриста. Если будут обращения, придется направлять людей в Могилев или Минск.



## ЦІ МОЖНА З ПРАФСАЮЗНАЙ СІМВОЛІКАЙ КАРМІЦЬ ГАЛУБОЎ?

### Уладзімір Малей, прававы інспектар прафсаюза РЭП, Брэст

Прафсаюзная арганізацыя горада Брэста прыняла рашэнне, цытую:

"У мэтах прыцягвання працоўных у прафсаюз праводзіць інфармацыйную працу аб дзейнасці прафсаюза на плошчы Леніна ў г. Брэсце па нядзелях з 12 да 13 гадзін з выкарыстаннем прафсаюзнай сімволікі (сцяга) і друкаванай прадукцыі.

Інфармацыйную працу аб дзейнасці прафсаюза на плошчы Леніна ў г. Брэсце дaручыць сябрам прафсаюза, у тым ліку Куценку Аляксандру Мікалаевічу."

У Брэсце на плошчы Леніна звычайна збіраюцца людзі і абмяркоўваюць праблемы, ужо па традыцыі прыходзяць карміць галубоў. Вось Куценок і хадзіў са сцягам, з прафсаюзнай прэсай, кантактаваў з працоўнымі, рабіў дaручаную яму справу, і ніхто яго не чапаў.

Пасля чарговай нядзелі 17 траўня, у пятніцу, у лазні, куды ён звычайна ходзіць, яму ўручылі позву без даты з неправільнымі дадзенымі. Я параіў пакуль нікуды не хадзіць, звярнуўся ў суд і ў рэшце рэшт высвятліў, што суд прызначаны на 28 траўня. Паколькі позва Куценку была



несапраўдная, я з'явіўся ў суд сам. Сведка, міліцыянт, паказаў, што Куценок знаходзіўся 17 мая на плошчы са сцягам, размахваў ім, потым ішоў наперадзе калоны. На пытанне, ці выкрыкваў нешта, заявіў, што не чуў. Я пагаварыў з суддзёй, і мы пагадзіліся, што паседжанне адкладуць, а Куценок з'явіцца сам.

Увечары таго ж дня пасяджэнне працягнулася. Мы падрыхтавалі дакументы – рашэнне першаснай арганізацыі прафсаюза аб накіраванні на плошчу для матывацыі сяброўства ў прафсаюзе, дакументы па сімволіцы, Зінаіда Міхнюк выступіла ў якасці сведкі. Але суддзя Куроўскі Д., нягледзячы на нашыя аргументы, прыняў рашэнне ўляпіць 30 базавых. Суддзя гэты ўжо не першы раз выносіць рэпрэсіўныя рашэнні па

# ГЕНАДЗЬ ФЯДЫНІЧ: ЛІДЭРЫ СТВАРАЮЦЦА Ў ГРАМАДСТВЕ



Тое, што беларусы цяпер хочуць паставіць подпісы за каго заўгодна, толькі не за Лукашэнку, не толькі абурае ўладу. Гэта яе палохае. Гэта сапраўдная пагроза для той улады, якая сфармавалася за апошнюю чвэрць стагоддзя. Простыя людзі, не актывісты, у свой выходны дзень у масках гатовыя стаяць у чарзе, каб выказаць свае стаўленне да гэтай улады. Гэтага яшчэ не было. Зразумела, ідуць размовы, спрэчкі. Але гэта не мітынг, не спланаваная акцыя. Гэта натуральная рэакцыя грамадзян на тое, што адбываецца ў нас у краіне. У іх прачынаецца не толькі пачуццё незадаволенасці, але і пачуццё годнасці, пачуццё адказнасці за сябе, за сваіх дзяцей, за Радзіму. Яны ставяць подпісы за перамены.

Я лічу, што Беларусь ужо не будзе ранейшай, ужо нейкая рыса пройдзеная. І позна ўжо палохаць рэпрэсіямі. Гэта створыць яшчэ больш праблем для самой улады, штурхае яе на шлях недаравальных злачынстваў.

Адметнасць цяперашняй сітуацыі ў тым, што яе стварыла не апазіцыя, не альтэрнатыўныя кандыдаты. Па-сутнасці, яе стварыла сама ўлада. Лідэры, якіх праз розныя «праймерысы» былі нездольныя абраць апазіцыйныя структуры, бо лідэра «абраць» галасаваннем немагчыма, пачалі стварацца ў народзе. Невядома, ці гэта будуць сённяшнія кандыдаты, ці іншыя асобы, пра якіх мы яшчэ нават не чулі, гэтыя лідэры ўжо фармуюцца ў нетрах грамадства.

Магчыма, што ніхто з альтэрнатыўных кандыдатаў не будзе зарэгістраваны, што самі гэтыя выбары нічога не зменяць, бо мы ўсе ведаем, як іх робяць. Паглядзім па сітуацыі, што будзе найлепшым, – удзел альбо татальнае ігнараваньне. Але працэс змены ўлады ўжо пайшоў, і гэта адчуваюць усе ў грамадстве, у тым ліку і тыя, хто «наверсе».

Ад усіх нас будзе залежыць, якімі будуць перамены, у які бок рушыць краіна. Абыякавасць, неразумнасць, дробная амбіцыйнасць могуць завесці ў пастку, з якой не будзе выйсця. Але я веру ў наш народ, у Беларусь.

# ЗА ИНФОРМАЦИЮ О ВКЛЮЧЕНИИ В БАЗУ «ТУНЕЯДЦЕВ» ПРИДЕТСЯ ЗАПЛАТИТЬ

С 1 декабря 2018 года в Беларуси запустили базу данных трудоспособных граждан, не занятых в экономике. С этой даты белорусы могут онлайн проверить, не включили ли их в базу тунеядцев, — на Едином портале электронных услуг. Эта услуга была бесплатной. Однако теперь ее предоставляют за деньги.

В Национальном центре электронных услуг FINANCE. TUT.BY рассказали, что услуга 3.33.03.2 «Предоставление сведений об отнесении трудоспособного гражданина к не занятым в экономике» стала платной с марта этого года. Тариф — 0,42 рубля за один заказ. Услуга предоставляется физическим лицам по предоплате. В момент получения услуги будет выставлен номер заказа для оплаты в ЕРИП. Для получения доступа к услуге необходимо направлять заявку, заключается договор, оплата за услугу проходит по ежемесячным актам выполненных работ. В НЦЭУ уточнили, что получать услугу могут граждане только в отношении себя лично.

Заплатить 0,42 рубля также придется за информацию, включили ли вас по тунеядскому декрету в число тех, кто должен оплачивать некоторые ЖКУ по полным тарифам. Код этой услуги — 3.33.04.2. Оплатить услугу можно в ЕРИП или в банковском отделении.

Получить услугу можно в личном кабинете при наличии сертификата электронной цифровой подписи физического лица либо уникального идентификатора. Уникальный идентификатор — это специальный логин (имя учетной записи гражданина) и пароль — средство идентификации гражданина при получении электронных услуг через личный электронный кабинет на Едином портале электронных услуг.

Чтобы посмотреть на Едином портале электронных услуг, включили ли вас в базу тунеядцев, нужно получить ключ электронной цифровой подписи или уникальный идентификатор, то есть логин и пароль. Они потребуются для ввода в личном электронном кабинете на Едином портале электронных услуг. Получить логин и пароль можно в службе «Одно окно» по месту жительства или в Национальном центре электронных услуг.

После авторизации на Едином портале электронных услуг нужно выбрать в списке доступных услуг категорию «работа и занятость», код услуги — 3.33.03.2 («Предоставление сведений об отнесении гражданина к не занятым в экономике»).

Чтобы бесплатно узнать включили ли вас в базу «тунеядцев» можно обратиться в постоянно действующую комиссию по координации работы по содействию занятости населения по месту регистрации. Это можно сделать по телефону или через письменное обращение, в том числе через электронную почту комиссии. При этом надо сообщить в том числе свой идентификационный номер. Но нужно учитывать график работы подобных комиссий. В этой ситуации возникает также вопрос с защитой персональных данных при подобных обращениях.

*По материалам finance.tut.by*

справах грамадзкіх актывістаў.

Натуральна, прысуд абскардзім. Пратаколы былі складзеныя з памылкамі. Уся справа павінна быць вернута на дапрацоўку.

Самае галоўнае, што чалавека, па сутнасці, асудзілі за прафсаюзную працу, за тое, што ён выконваў пастанову легальнай прафсаюзнай арганізацыі, якая мае права прапагандаваць сваю дзейнасць і свае каштоўнасці.

Прафсаюз давядзе інфармацыю пра пераслед сябра прафсаюза Куценка і пра перашкоды дзейнасці прафсаюза РЭП з боку суда Ленінскага раёна г. Брэста ў Міжнародную арганізацыю працы (МАП).

# МОТ ЗАПУСТИЛА ГЛОБАЛЬНОЕ ИССЛЕДОВАНИЕ ПО ПРОБЛЕМАМ МОЛОДЕЖИ В УСЛОВИЯХ ПАНДЕМИИ

Способствовать выдвижению молодежи на передний край борьбы с кризисом, вызванным пандемией COVID-19, – цель исследования, предпринятого Глобальной инициативой по созданию достойных рабочих мест для молодежи и ее партнерами, включая Международную организацию труда, Основную группу «Дети и молодежь» ООН, AIESEC, Европейский молодежный форум, Чрезвычайный целевой фонд ЕС для Африки и Управление Верховного комиссара ООН по правам человека.

Тема исследования – воздействие пандемии COVID-19 на положение в области прав молодежи и прежде всего в сфере занятости и образования.

Принять участие в исследовании можно на 17 языках по этой ссылке:

https://www.decentjobsforyouth.org/campaign/COVID19-survey

# БЕЛАРУСЬ: У РАБОТНИКОВ СТАЛО МЕНЬШЕ ПРАВ




В марте Государственный департамент США опубликовал очередной доклад о правах человека в мире и Беларуси. В докладе отмечается, что Беларусь остается авторитарным государством. По мнению Государственного департамента, с тех пор, как Александр Лукашенко пришел к власти в 1994 году, он «укрепил свое господство над всеми институтами и установил верховенство закона авторитарными средствами, включая манипулирование выборами и произвольные указы». Все последующие выборы, в том числе выборы в Палату представителей в 2019 г., не соответствовали международным стандартам.

«Власти на всех уровнях часто действовали безнаказанно и не наказывали правительственных чиновников или сотрудников правоохранительных органов, которые нарушали права человека», – говорится в докладе.

В докладе перечислены основные нарушения прав человека в Беларуси: произвольные аресты и задержания; опасные для жизни условия в тюрьме; произвольное или незаконное вмешательство в личную жизнь; значительные проблемы с независимостью судебной власти; необоснованные ограничения свободы слова, печати и Интернета, включая цензуру, блокировку веб-сайтов и наличие законов об уголовной ответственности за диффамацию государственных служащих; задержание журналистов.

Значительный раздел доклада посвящен правам трудящихся и их нарушениям в Беларуси. Мы публикуем перевод этого раздела с некоторыми сокращениями.

## Государственный департамент США

## ОТЧЕТ О ПРАВАХ ЧЕЛОВЕКА ПО СТРАНАМ ЗА 2019 ГОД: БЕЛАРУСЬ

### Раздел 7. Права работника

#### А. СВОБОДА АССОЦИАЦИИ И ПРАВО НА ВЕДЕНИЕ КОЛЛЕКТИВНЫХ ПЕРЕГОВОРОВ

Хотя закон предусматривает права рабочих создавать независимые профсоюзы и вступать в них, а также организовывать забастовки и участвовать в них, за исключением тех, кто занят в органах государственной безопасности и армии, он накладывает ряд серьезных ограничений на осуществление этих прав. Закон предусматривает право на организацию и ведение коллективных переговоров, но не защищает от дискриминации профсоюзы. По словам независимых профсоюзных активистов, работники, которых уволили за профсоюзную деятельность, ограничены в правах на восстановление на работе или оспаривании увольнения в суде.

Гражданский кодекс предусматривает наказания в виде штрафов за нарушения свободы собраний или коллективных переговоров, посвященных предотвращению нарушений. Правительство не налагало такие штрафы.

Правительство и власти сурово ограничивали деятельность независимых профсоюзов. Подконтрольная правительству Федерация профсоюзов Беларуси (ФПБ) – крупнейшая федерация профсоюзов, насчитывающая более четырех миллионов членов. Она во многом напоминает своих советских предшественников и служит механизмом контроля и распределения благ. Белорусский конгресс демократических профсоюзов (БКДП), состоящий из четырех независимых профсоюзов и имеющий приблизительно 10 000 членов, является крупнейшим не-зависимым профсоюзным объединением, но жесткий контроль правительства над требованиями по регистрации, организации и проведении публичных мероприятий затруднил работу Конгресса по наращиванию сил и организации забастовок.

Правительство не соблюдало право на свободу ассоциаций и ведение коллективных переговоров. Запрещающие требования, касающиеся того, чтобы работодатель сотрудничал только со своим самым крупным профсоюзом, продолжали создавать значительные препятствия для формирования новых профсоюзных организаций. Профсоюзные организации могут быть исключены из регистрации по решению органа местной власти без какой-либо судебной процедуры. Регистратор вправе снять профсоюз с регистрации, если после выдачи профсоюзу письменного предупреждения о том, что организация нарушает законодательство или собственный устав, нарушения не устраняются в течение месяца. Власти продолжали сопротивляться попыткам рабочих покинуть официальный профсоюз и вступить в независимый.

Требования законодательства к проведению забастовок высоки. Например, забастовки могут проводиться только через три или более месяцев после неудачи в разрешении спора между профсоюзом и работодателем. Продолжительность забастовки должна быть указана заранее. Кроме того, минимальное количество работников должно продолжать работать во время забастовки. Тем не менее, эти требования были в значительной степени неактуальными, поскольку официальные профсоюзы, которые представляли почти всех работников, находились под контролем правительства. Государственные органы и руководители государственных предприятий регулярно вмешивались в деятельность профсоюзов и препятствовали усилиям работников вести коллективные переговоры, в некоторых случаях произвольно их приостанавливая. Центральные и местные власти неоднократно блокировали попытки рабочих организовать забастовки, объявляя их незаконными. Члены профсоюзов, которые участвовали в несанкционированных публичных демонстрациях, подвергались аресту и задержанию. Из-за постоянной атмосферы репрессий и страха перед тюремным заключением в течение года таких публичных акций было проведено немного.

Закон о массовых мероприятиях также серьезно осложнял проведение демонстраций, митингов и другие публичных акций, ограничивая право профсоюзов на организацию и забастовку. Никакая иностранная помощь не может быть оказана профсоюзам для проведения семинаров, собраний, забастовок, пикетов и т.д., а также на «пропагандистскую деятельность», направленную на своих собственных членов, без разрешения властей.

Усилия правительства по подавлению независимых профсоюзов включали в себя частые отказы в продлении трудовых договоров с членами независимых профсоюзов и отказ в регистрации организаций независимых союзов. По словам лидера БКДП Александра Ярошука, после указа 1999 г., обязывающего организации профсоюзов регистрироваться в органах местной власти, эти власти не зарегистрировали ни одной новой первичной организации независимых профсоюзов, но 15 января власти удовлетворили третью заявку на регистрацию первички БНП (Независимого профсоюза шахтеров, работников химической, нефтеперерабатывающей, энергетической, транспортной, строительной отрасли и других отраслей) в Солигорске. Регистрация последовала за реструктуризацией государственного производителя калийных удобрений «Беларуськалий», что привело к созданию ряда дочерних предприятий, включая «Реммонтажстрой», где 400 рабочих хотели сохранить свое членство в независимом профсоюзе БНП. Власти регулярно увольняли работников, которых считали «лидерами» или которые участвовали в деятельности НПО или политической деятельности оппозиции.

В августе 2018 года Минский районный суд осудил председателя независимого профсоюза работников радио и электронной промышленности (РЭП) Геннадия Федынича и главного бухгалтера Игоря Комлика за якобы уклонение от уплаты налогов в 2011 г.

и приговорил их обоих к четырем годам домашнего ареста. Суд также запретил этим профсоюзным деятелям занимать какие-либо административные должности в течение пяти лет. Протестующие возле здания суда были задержаны во время их выступления. В ноябре 2018 г. Минский городской суд отклонил апелляцию профсоюзных лидеров. Президентская амнистия, принятая в ноябре 2019 г., сократила сроки Федынича и Комлика на год.

10 мая 2019 г. Федынич сообщил, что Пенитенциарная инспекция ослабила условия его четырехлетнего ограничения свободы. Согласно первоначальному приговору о домашнем аресте Федынич должен был находиться дома с 7 часов вечера до 6 часов утра, и ему было запрещено покидать свою квартиру в выходные и праздничные дни. С мая 2019 года Федыничу разрешено посещать медицинские учреждения, почтовые отделения, магазины и другие об-щественные учреждения с 6 часов до 8 вечера в будние дни, а также выходить из своей квартиры к почтовому ящику, который находится внутри его же многоквартирного дома, в любое время. Время его комендантского часа было увеличено с 7 часов вечера до 9 вечера. Власти отклонили просьбу Федынича разрешить ему посещать церковь и помогать своим больным родственникам вне дома в выходные дни.

Правительство требует, чтобы государственные служащие, включая работников государственных предприятий, которые составляют примерно 70 процентов рабочей силы, подписывали краткосрочные трудовые контракты. Хотя срок действия таких контрактов может составлять до пяти лет, большинство из них заключается сроком на год, что дает властям возможность увольнять неугодных сотрудников, отказываясь продлевать их контракты. Многие активисты независимых профсоюзов, политических партий и групп гражданского общества поте-ряли из-за этой практики свои рабочие места. Указ правительства дает работодателям право подписывать бессрочный трудовой контракт с работником только после пяти лет безупречного поведения и отличной работы.

Члены оппозиционных политических партий и демократические активисты иногда сталкивались с трудностями при поиске работы из-за давления, оказываемого властями на работодателей.

В 2014 г. президент издал свой Декрет № 5 «Об усилении требований к руководителям и сотрудникам организаций», который, как заявили власти, был направлен на искоренение «неумелого руководства», укрепление дисциплины и недопущение назначения нечестных руководителей на новые должности. Среди других новаций декрета – право руководителей уменьшить




вознаграждения (премии) работникам (которые часто составляли большую часть их заработной платы), при этом увольнять работников стало проще. Независимый профсоюзный юрист сообщал в прессе, что в соответствии с новым декретом у работников стало меньше прав.

### B. ЗАПРЕТ ПРИНУДИТЕЛЬНОГО ИЛИ ОБЯЗАТЕЛЬНОГО ТРУДА

Законодательство запрещает все формы принудительного или обязательного труда, но пра-вительство не обеспечило эффективное соблюдение его положений. (…)

Правительство продолжило советскую практику субботников, которая требует, чтобы госслужащие, работники государственных предприятий и студенты, получающие государственные стипендии бесплатно отработали по несколько субботников в год. Работодатели и власти угрожали работникам, которые отказались выходить на субботники, штрафами или лишением премий. В некоторых населенных пунктах местные власти привлекали работников госпредприятий и студентов к уборке урожая в сентябре-октябре. Например, студенты Витебского университета сообщали, что администрация заставляла их собирать яблоки в местном колхозе две недели в сентябре.

Бывшие заключенные утверждали, что их месячная зарплата в заключении составляла всего три-четыре рубля (от 1,50 до 2,00 долларов США). Высокопоставленные должностные лица Генеральной прокуратуры и Министерства внутренних дел заявили в ноябре 2015 года, что, по крайней мере, 97 процентов всех трудоспособных заключенных работают в соответствии с требованиями закона, за исключением пенсионеров и инвалидов, и что труд в тюрьме является важным и полезным для их реабилитации и последующей реинтеграции в общество.

(…)

### D. ДИСКРИМИНАЦИЯ В ОТНОШЕНИИ ЗАНЯТОСТИ И ПРОФЕССИЙ

Законодательство запрещает дискриминацию по признаку расы, пола, языка или социального положения. Однако это законодательство не применяются конкретно к занятости или профес-сии. Правительство не обеспечило эффективное соблюдение этих законов и не предусматривало каких-либо эффективных мер наказания для предотвращения нарушений. (…)

О законе, требующем равной оплаты мужчин и женщин за равный труд, вспоминали редко, и в 2016 году министр труда и социального обеспечения заявила, что в среднем женщины получали на 24 процента меньше, чем мужчины. (…)

Очень немного женщин занимают посты в высших эшелонах управления или правительства, большинство их сосредоточено в низкооплачиваемом государственном секторе. Хотя закон предоставляет женщинам право на трехлетний отпуск по беременности и родам с гарантией работы по возвращении, работодатели часто обходят эти меры обеспечения занятости, используя краткосрочные контракты, а затем отказываются продлевать контракт с женщиной, когда она забеременела.

Правительственный запрет на рабочий день дольше семи часов для людей с ограниченными возможностями (инвалидов), как сообщается, приводит к тому, что компании неохотно нанимают их. Местные НПО сообщили, что до 85 процентов инвалидов были безработными. Власти предоставляли инвалидам минимальные социальные пособия, а при расчете пенсий не учитывались группы инвалидности. Члены паралимпийских команд страны получали половину от зарплат и призовых, полагающихся спортсменам-неинвалидам.

### E. ПРИЕМЛЕМЫЕ УСЛОВИЯ РАБОТЫ

(…)

Законодательство определяет минимальные условия безопасности (охраны труда) на рабочем месте, но работодатели часто игнорируют эти положения. Рабочие на многих предприятиях тяжелого машиностроения не имеют даже минимального защитного снаряжения. У государственной инспекции по труду не хватает полномочий, чтобы заставить работодателей соблюдать требования, и она часто сама игнорировала нарушения. Количество инспекторов недостаточно для профилактики и сдерживания нарушений.

За соблюдение этого законодательства отвечало Министерство труда и социального обеспечения. Информация о ресурсах, проведенных проверках, исправлении нарушений и штрафах отсутствовала. Правительство сообщило, что приблизительно 400 000 из 4,5 миллиона работающих были заняты в неофициальной экономике. Указанное законодательство на этих «неофициальных» работников не распространяется.

Минтруда сообщило, что в 2018 г. на рабочих местах погибло 146 человек против 115 в 2017 г.

Законодательство не предоставляет работникам права не выходить на работу, которая угрожает их здоровью или безопасности без угрозы потерять эту работу.

# МАСКІ СУПРАЦЬ КАРОНАВІРУСА



Аўтары артыкула, апублікаванага ў часопісе Science, пішуць, што ў выпадку з Covid-19 інфікаваныя людзі, якія доўга (а некаторыя і зусім) не праяўлялі бачных сімптомаў захворвання, з'яўляюцца актыўнымі носьбітамі віруса. Пры размове і проста дыханні яны выкідаюць у атмасферу паветрана-кропельную сумесь, насычаную вірусамі, якая падоўгу вісіць у паветры, асабліва ў закрытых памяшканнях. Пры ўдыханні гэтая сумесь можа трапіць глыбока ў лёгкія, дзе ўзнікае ачаг заражэння.

Аўтары даследавання адзначаюць, што калі людзі дыхаюць, яны вылучаюць часціцы вільгаці памерам ад 0,1 да 1000 мкм (мікрон). Гэтыя часцінкі распаўсюджваюцца па паветры на розныя адлегласці ў залежнасці ад іх памеру, сілы прыцягнення, інэрцыі, хуткасці выпарэння і шэрагу іншых фактараў.

Часцінкі буйнейшыя хутчэй асядаюць на паверхні, заражаючы яе. Тыя, што мяльчэйшыя, выпараюцца хутчэй, але і лягчэй пераносяцца па паветры, прычым на значныя адлегласці.

Як высветлілі навукоўцы, часціцы субмікроннага памеру ўяўляюць павышаную небяспеку, пранікаючы глыбока ў лёгкія і абыходзячы імунную сістэму, што дазваляе вірусу рэплікавацца ўтрая хутчэй. Такім чынам чалавек яшчэ не падазрае аб заражэнні, а сам ужо з'яўляецца актыўным носьбітам віруса.

Як паказаў прыклад Кітая, менавіта гэтыя «ціхія носьбіты», што не праяўляюць сімптомаў заражэння, у 79% выпадкаў і былі крыніцай далейшага заражэння.

Для барацьбы з распаўсюджваннем Covid-19 Сусветная арганізацыя аховы здароўя (СААЗ) рэкамендавала трымаць сацыяльную дыстанцыю ў два метры, але гэтая парада была заснаваная на даследаваннях паветрана-кропельных сумесяў, якія праводзіліся яшчэ ў 1930-я гады. Але сёння мы ведаем, што кропля памерам у 100 мікрон пры адсутнасці ветру асядзе з вышыні ў 3 метры прыкладна за 5 секунд, а часціца памерам у адзін мікрон пратрымаецца ў паветры больш за 12 гадзін.

Так што парады СААЗ адносна двух метраў могуць апынуцца неадэкватнымі для многіх памяшканняў, дзе паветрана-кропельная сумесь можа вісець у паветры гадзінамі, назапашвацца з цягам часу і разносіцца паветранымі патокамі куды далей, чым на пару метраў.

Ды і для адкрытых прастораў маецца шмат розных фактараў. З аднаго боку, здавалася б, канцэнтрацыя вірусаў павінна рэзка падаць, ды і ўльтрафіялет робіць сваю добрую справу, забіваючы іх. З іншага боку, вірусы могуць прыліпаць да часцінак пылу і іншых забруджвальнікаў у атмасферы і з імі распаўсюджвацца на вялікія адлегласці, не страчваючы сваёй вірулентнасці.

Да таго ж, калі прыняць да ўвагі, што вірус Covid-19 змяшчаецца ў субмікронных часціцах, то эфект яго распаўсюджвання можна параўнаць з цыгарэтным дымам. А калі да вас дайшоў пах, значыць, даляцелі б і вірусы.

І вось тут мы падыходзім да самага галоўнага – да масак. У закрытых памяшкання навукоўцы рэкамендуюць насіць шчыльна прылеглыя маскі, нават калі вы выконваеце сацыяльную дыстанцыю ў два метры. У адваротным выпадку, як сцвярджаюць спецыялісты, ні тэставанне, ні дыстанцыяванне, ні адсочванне кантактаў не дапамогуць, бо бессімптомна заражаным можа апынуцца любы чалавек.

Нават самім медыкам не атрымліваецца пазбегнуць інфекцыі, бо, як правіла, менавіта паветраным шляхам адбывалася другаснае заражэнне медыцынскага персаналу бальніц і дамоў для састарэлых.

Менавіта пасля таго, як было выяўлена, што перадача інфекцыі бессімптомнымі носьбітамі магла стаць прычынай распаўсюджвання Covid-19 ва ўсім свеце, СААЗ рэкамендавала ўсім без выключэння насіць маскі.

Аўтары артыкула ў Science адзначаюць, што маскі сапраўды забяспечваюць нас важным бар'ерам, зніжаючы колькасць шкодных вірусаў у выдыху хворых з нязначнымі сімптомамі ці ўвогуле без такіх. Матэрыял, з якога зроблены хірургічныя маскі, прыкметна паніжае верагоднасць заражэння Covid-19, а ў выпадку інфікавання – цяжар самога захворвання. Асабліва важна насіць маскі ва ўмовах, дзе канцэнтрацыя віруса можа быць падвышанай: у медыцынскіх установах, транспарце, рэстарацыях і шматлюдных памяшканнях з дрэннай вентыляцыяй.

Здольнасць масак хатняга вырабу да эфектыўнай фільтрацыі паветрана-капельных сумесяў, нягледзячы на розніцу ў таўшчыні, матэрыялах і колькасці іх слаёў, як высветлілася, не моцна саступае здольнасцям прафесійных хірургічных масак.

Як сведчаць эпідэміялагічныя звесткі, такія краіны, як Тайвань, Сінгапур і Паўднёвая Карэя, лепш за ўсё справіліся з распаўсюджваннем Covid-19. І менавіта ў гэтых краінах было ўведзена абавязковае нашэнне масак.

Да прыкладу, на Тайвані з насельніцтвам у 24 млн, дзе першы выпадак каронавіруса быў зарэгістраваны яшчэ 21 студзеня 2020 г., было адзначана ўсяго 441 выпадак заражэння і 7 смерцяў ад каронавіруса.

Для параўнання, у Нью-Ёрку, дзе пражывае 20 млн чалавек і першы выпадак быў адзначаны 1 сакавіка, каронавірусам заразілася звыш 350 тысяч чалавек і памерла 24 тысячы.



Хутка ўвёўшы ў дзеянне план змагання з эпідэміяй, улады Тайваня не звярталіся да жорсткага карантыну, але прынялі шэраг мер, якія паспяхова прадухілілі распаўсюджванне інфекцыі. І адной з такіх мер стала абавязковае нашэнне масак у грамадскіх месцах.

На думку даследчыкаў, гэтак ашаламляльныя адрозненні краін у тым, што тычыцца даступнасці і ўжывання масак, адыгралі немалаважную ролю ў стрымліванні або, наадварот, распаўсюджванні інфекцыі.

У нас у Беларусі не толькі ўлады і адпаведныя медычныя ўстановы не настойваюць на нашэнні масак, але часта самі людзі неахвотна імі карыстаюцца. Часам гэта тлумачаць тым, што ў масцы непрыгожы выгляд, ці што размаўляючы ў масцы, выказваеш непавагу да суразмоўцы. Але свет ужо змяніўся. Трэба зразумець, што калі вы звяртаецеся да свайго суразмоўцы ў масцы, тым самым вы паказваеце, што клапоціцеся ня толькі пра сваё, але і пра яго здароўе, паважаеце яго сацыяльную дыстанцыю. Адсутнасць маскі на твары ў людным месцы – прызнак безадказнасці ці проста дурасці. Мы фактычна ўжо адмовіліся ад абавязковага сціскання рук. Варта прызвычаіцца да масак. Чым хутчэй навучымся гэтаму, тым хутчэй пераможам пандэмію.

Але, трэба прызнаць, не ўсе маскі патрэбныя нашаму грамадству.

*Па матэрыялах Інтэрнэт*



РС **ПРАЧЫТАЎ – ПЕРАДАЙ ІНШАМУ!**

## Как вступить в независимый профсоюз РЭП?

Найдите в списке ваш областной город и свяжитесь с руководителем региональной организации, вам объяснят дальнейшие действия. Членом профсоюза может стать любой человек старше 14 лет, вне зависимости от того, где он работает, учится, временно не работает или на пенсии.

**г. Минск — ул. Кульман, 4, тел.: +375 17 3424651, +375 17 3484187, +375 17 2343331 (юрист)**
**г. Брест — ул. 17-го сентября, д. 22-24,1-й этаж, тел.: +375 29 6459744, +375 29 5220607 (юрист)**
**г. Витебск — тел.: +375 29 5981995**
**г. Гродно — тел.: +375 29 7800651**
**г. Гомель — ул. Полесская, д.52, тел. +375 23 2335625 (офис), +375 29 6992865, +375 29 6547011 (юрист)**
**г. Могилев — ул. Т. Карпинской, д. 9, тел.: +375 222 625807**
**г. Орша — ул. Комсомольская, д.16, кв. 4., тел.: +375 29 7125755; +375 33 6840516**
**г. Бобруйск — ул. Октябрьская, д.173а, офис ОГП, тел.: +375 29 7469988**
**г. Солигорск — тел. +375 29 6718111**
**г. Мозырь — тел. +375 33 6167755**

## ПРОФСОЮЗ РЭП — РЕАЛЬНАЯ ЭФФЕКТИВНАЯ ПОМОЩЬ!

*Да ўвагі чытачоў: у некаторых асобнікаў мінулага (№ 6) выпуска РС стаіць памылковая дата. Правільная дата: 10 красавіка 2020*

Отпечатано на множительной технике профсоюза РЭП. г. Минск, ул. Кульман, 4. Тираж 299 экз.
r.salidarnasc@gmail.com Распространяется на правах внутренней документации бесплатно
Мнения авторов статей могут не совпадать с мнением руководства профсоюза РЭП
**Ответственный за выпуск:**
**Л. Бураковский**